ДУК "Свіслацкая раённая бібліятэка"
Аддзел бібліятэчнага маркетыгу

# Новы Двор.
# Ад княжацкай паляўнічай рэзідэнцыі да аграгарадка



Свіслач, 2019

Першая дакладная звестка аб Новым Двары адносіцца да 1409 года. Яна мае дачыненне да палявання Вітаўта і Ягайлы ў Белавежскай пушчы. Новы Двор належыў князю Вітаўту як маёмасць яго бацькі Кейстута і з’яўляўся яго паляўнічай “базай”. Вітаўт паляваў тут у лютым 1421 г., а падчас эпідэміі чумы 1426 г. вялікі князь разам з Ягайлам і сваімі дваровымі людзьмі хаваўся ў Новым Двары, бавячы час паляваннямі.



*Князь Вітаўт Вялікі*

У XV – пачатку XX стст. у эканамічным плане Новы Двор належыў да той групы мястэчак, якія не мелі ўмоў для развіцця ўласнай прамысловасці і паступова станавіліся вёскамі. У палітычным становішчы жыхары паселішча прэтэндавалі на захаванне свайго мястэчковага статуса, за што ішло моцнае супрацьстаянне іх з уладамі: мястэчкоўцы адмаўляліся выконваць сялянскія павіннасці і патрабавалі бязвыкупнай перадачы ім зямлі як прадстаўнікам мяшчанскага саслоўя.

Новы Двор ляжаў на важнай каралеўскай дарозе, якая была заложана ў 1518 г. і злучала Вільню з Кракавам. Праз мястэчка ішла дарога ў Ружаны, а адтуль далей – на Маскву. Тут праводзіліся два таргі на тыдзень: па серадах і нядзелях, – пасяленне было цэнтрам воласці. Гэтая традыцыя захавалася да пачатку XX ст.

XVI ст. было залатым векам беларускай гісторыі, што ў поўнай меры датычыць і Новага Двара. Мястэчка шматразова прымала каранаваных асоб, якія падарожнічалі з Кракава ў Вільню. Так, вядома, што 15 мая 1544 г. тут бываў кароль і вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст, які ехаў з Кракава ў Вільню. Незвычайную і ўражваючую працэсію магло назіраць мястэчка ў 1551 г., калі праз яго з Кракава ў Вільню праходзіў пахавальны картэж з целам Барбары Радзівіл. Паводле сведчанняў асобных храністаў, кароль Жыгімонт II Аўгуст пешшу ішоў за катафалкам з труной каханай.



*Жыгімонт II Аўгуст*

29 красавіка 1562 г. кароль выдаў універсал, скіраваны да “войтаў, бурмістраў, радцаў і ўсіх мяшчан месцаў нашых: Ваўкавыска, Здзітава, Моўчадзі, Поразава і Новага Двара”, накладаючы на ўсіх гандляроў 10-працэнтны падатак на Лівонскую вайну.

Па свайму стратэгічнаму палажэнню і эканамічнаму значэнню Новы Двор меў высокі ўзровень. Так, на карце 1508 г. пазначана толькі некалькі гарадоў рэгіёна, у тым ліку Брэст і, што цікава, Новы Двор. Няма на ёй ні Свіслачы, ні Поразава, ні нават Ваўкавыска. На так званай Радзівілаўскай карце 1613 г. знаходзяцца толькі Новы Двор і Поразава. На карце “Вялікае Княства Літоўскае і Белая Русь”, складзенай Г.Бакланам каля 1654 г., зноў адзначаны толькі Новы Двор.

Новы Двор быў спалены шведамі падчас вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай (1654-1667 гг.) і Швецыяй (1665 г.). Аб гэтых падзеях

нагадвае вядомы этнограф і краязнаўца Міхал Федароўскі: “Кажуць, што калі ў нас ваявалі шведы, аднаго з іх пакусаў шалёны сабака. Вылячыўся з дапамогай каменя, які ляжаў у наваколлі Новага Двара, і гэта падгледзелі мясцовыя жыхары. Да сённяшняга дня яны таксама лечацца гэтым каменем”. Але адломваць ад яго кавалачкі патрэбна было на ўзыходзе або на захадзе сонца.

У другой палове XVII ст. Новы Двор атрымаў Магдэбургскае права і герб і стаў мястэчкам. Правы і прывілеі Новага Двара былі пацверджаны Янам Казімірам Вазай (3.08.1661 г.), Міхалам Карыбутам Вішнявецкім (20.03.1670 г.), Янам III Сабескім (20.01.1679 г.), Аўгустам II Моцным (28.11.1718 г.), каралём і вялікім князем Аўгустам III Прыгожым (14.11.1744 г.). Нехта з апошніх манархаў і надаў Новаму Двару герб з выявай збройнага арханёла Міхаіла, які топча пераможанага чорта і пры гэтым правай рукой абапіраецца на меч, а ў левай трымае вагі. Даследчык А.Шаланда выказвае думку, што гэтым каралём мог быць Міхал Карыбут Вішнявецкі, які надаў мястэчку герб свайго святога заступніка, бяручы за ўзор герб ваяводскага Навагрудка.





*Пячатка Новага Двара з гербам і надпісам 1792 г.*

Новы Двор моцна пацярпеў у выніку вайны 1812 г. Мясцовае насельніцтва рабавалі расійскія войскі, а пасля іх і войскі напалеонаўскіх саюзнікаў. 18 чэрвеня 1812 г. у Новым Двары размясціўся VII корпус генерал-лейтэнанта М.М.Раеўскага, будучага героя бітвы пад Барадзіно.

У пачатку жніўня расійскія войскі пад камандаваннем генерал-маёра К.Б.Кнорынга стаялі ў Новым Двары і Поразаве. У перыяд з 30 ліпеня па 9 жніўня армія К.Б.Кнорынга з Конна-татарскім і Еўпаторыйскім татарскімі палкамі па загаду камандуючага 3-й арміяй Тармасава зрабіў рэйд на Пружаны – Новы Двор – Свіслач – Беласток. 2 жніўня 1812 г., паводле скаргаў мясцовых жыхароў, расійскія кавалерыйскія палкі вывезлі з мястэчка Новы Двор Ваўкавыскага павету ўсё харчаванне на 15 фурманках.

Праз тэрыторыю пасялення праходзілі войскі VII (саксонскага) корпуса пад камандаваннем французскага генерала Ж.Л.Рэнье. “Салдаты забіралі ўсё: харчаванне, коней, адзенне, інструменты, валоў гналі табунамі”, – апісаў невядомы аўтар праход праз мястэчка Новы Двор “вялікай арміі саксонскай VII корпуса пад камандаваннем Рэнье”.

На працягу XIX стагоддзя Новы Двор бачыў шмат грамадскіх і палітычных рухаў. Не абмінула мястэчка і паўстанне 1830-1831 гг. Цэнтрам паўстання на Гарадзеншчыне была Белавежская пушча. Па тэрыторыі ваколіц Новага Двара праходзілі паўстаўніцкія войскі генерала Д.Хлапоўскага, да якіх у Свіслачы далучыўся генерал Тадэвуш Тышкевіч, а таксама атрад партызан пад кіраўніцтвам тытулярнага дарадчыка, акруговага ляснічага Яўгена дэ Ронка, у шырэнгах якога сваімі доўгімі пер’ямі на

капялюшах вызначаліся стралкі Белавежскай пушчы. У чэрвені 1830 г. атрад генерала Хенрыка Дэмбінскага, рухаючыся на поўдзень па тэрыторыі Літвы і Беларусі, прайшоў праз Поразава і Новы Двор. Калі войскі Х.Дэмбінскага пакінулі межы Гродзенскай губерні, у ваколіцах Поразава, Лыскава і Новага Двара дзейнічаў атрад князя Гедройца.

Паводле эканамічнага стану ў 1833 г. у мястэчку было 90 драўляных хат, пражывала 409 жыхароў (206 мужчын, 203 жанчыны), дзейнічала драўляная царква.

У 1861 годзе, у час рэформы па адмене прыгоннага права, навадворцы адправілі ў Санкт-Пецярбург дэлегацыю на чале з Мацвеем Грушэўскім, каб дамагчыся перадзелу зямлі. Але судовая камісія ўсіх жыхароў прызнала мяшчанамі і пакінула ім старыя надзелы. Дзіўныя былі з навадворцаў "мяшчане": калі па даных 1886 г. 35% насельніцтва займалася земляробствам.

Жыхары Новага Двара актыўна ўдзельнічалі ў паўстанні1863-1864 гг. 13 мая 1863 г. каля Новага Двара адбылася сутычка расійскіх салдат і 40 казакаў з паўстанцамі. Са 101 навадворца была спагнана кантрыбуцыя агульнай лічбай у 1256 рублёў.



17 верасня 1867 г. у Новым Двары была асвечана новая царква ў гонар Арханёла Міхаіла – патрона мястэчка. У 1964 г. яе разабралі, а ў 90-х пачалі адбудоўваць.



У царкве знаходзіцца ікона Маці Божай Навадворскай. Хто яе напісаў, калі і якім чынам яна тут з'явілася, гэта інфармацыя не дайшла да нашых дзён. Мясцовыя жыхары ведаюць гісторыю, што калі ў вёсцы здарыўся пажар, людзі хацелі вынесці і зберагчы гэту ікону, каб яна не згарэла разам з царквою, але нават пяць чалавек не змаглі падняць яе. Калі агонь дайшоў да царквы, ён цудам спыніўся. Усе ўпэўнены, што гэта ікона патушыла агонь і зберагла астаўшуюся палову вёскі. Жыхары ўпэўнены, што цяпер Навадворская Маці Божая, як і раней, абараняе іх.

Пэўнае развіццё ў XIX стагоддзі атрымала культура. З 1860 г. у Новым Двары існавала царкоўнапрыходская школа. У 1862 г. адкрыта аднакласнае народнае вучылішча, з 1900 г. тут працавала і двухкласнае народнае вучылішча. У 1905 г. у ім вучыліся 89 хлопчыкаў і 16 дзяўчынак.

Перапіс 1897 г. зафіксаваў наяўнасць у Новым Двары сінагогі. Сінагога праіснавала тут па 1937 г., калі яе разам з часткай мястэчка знішчыў пажар. Адносна колькаснага складу навадворскага штэтла на працягу XIX ст. пражывала каля 20-ці сем'яў яўрэяў. У 1897 г. Новы Двор –

мястэчка Ваўкавыскага павета Поразаўскай воласці. Насельніцтва ў 1901 г. складала 1200 чалавек.

З 1921 г. па 1939 г. Новы Двор – у складзе Польшчы. З 1940 г. – цэнтр сельскага Савета адносіцца да Гродзенскай вобласці, Свіслацкага раёна.

Міжваеннае жыццё мястэчка цягнулася ў нетараплівым ходзе часу. Пераважная большасць насельніцтва займалася земляробствам. Невялікі гурток мясцовай інтэлігенцыі 30-х г. ХХ ст. складалі святар і настаўнікі В.Русакевіч і М.Навуменка.

Да найбольш трагічных падзей Новага Двара адносяцца пажары 1934 і 1937 гг., у выніку якіх амаль цалкам была знішчана драўляная забудова цэнтра мястэчка. Часам тут мелі месца канфлікты на канфесійнай глебе. Дзякуючы даследаванню А.Смаленчука, можна даведацца пра менталітэт навадворцаў і тыя рысы свядомасці, што захаваліся і да нашага часу, пра заўсёдную вольнасць жыхароў Новага Двара ў параўнанні з насельніцтвам суседніх вёсак. Яны часта ўжываюць тэрмін “навадворцы”, выразна адрозніваюць сябе ад жыхароў суседніх вёсак. Пры гэтым звычайна сцвярджалася “замкнёнасць” або “закрытасць” навадворцаў: некалі шлюбы яны бралі выключна са “сваімі”. Сярод жыхароў Новага Двара і сёння ёсць некалькі параднёных паміж сабой сем’яў, якія з’яўляюцца карэннымі жыхарамі пасялення: Грушэўскія, Ганчарэвічы, Грыцкевічы, Ботвічы, Каскевічы, Касінскія, Лісоўскія, Філіповічы, Гамановічы, Сычэўнікі, Катаркевічы.

Мястэчка перажыло жах войнаў мінулага ХХ стагоддзя. У Першай сусветнай вайне ўдзельнічала некалькі навадворцаў. У Грамадзянскай вайне на баку бальшавікоў змагаліся Ілля Ботвіч і Андрэй Ярашэвіч. Шмат выцярпела мястэчка і ў час Другой сусветнай вайны.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны усталявалася фашысцкая акупацыя. Новы Двор і ўсю Белавежскую пушчу фашысты ўключылі ў асаблівую акругу, якой кіравала усходне пруская адміністрацыя. У 1941-1942 гадах у ваколіцах пушчы эсэсаўцы спалілі дзесяткі населенных пунктаў. Пушча была напоўнена варожымі войскамі, у ёй знаходзілася 28 гарнізонаў, былі пабудаваны склады боепрыпасаў. З акупантамі змагаліся сотні партызан з ліку байцоў Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні ці збеглі з палону, а таксама мясцовае насельніцтва. Прыкладам гэтага з’яўляецца дзейнасць жыхара Новага Двара А.Шабата. Ён стаў адным з першых сувязных партызан, за што разам з М.Янушка быў арыштаваны. Нягледзячы на пабоі і пыткі, яны нікога не выдалі. Іх фашысты адпусцілі, пасля чаго А.Шабат пайшоў у лес у групу “Паддубнага”.

Брыгада імя Чапаева сумесна з Чырвонай Арміяй удзельнічала ў вызваленні Новага Двара. 13 чэрвеня 1944 года ў 16 гадзін атрады брыгады выйшлі з лясоў у раёне Парахаўні на дарогу Лыскава – Новый Двор з мэтай адрэзаць шлях адступаўшым немцам. У гэты час з’явілася разведка 130-га гвардзейскага палка 48-й стралковай дывізіі. Партызанскія мінёры прыступілі да размініравання дарогі. Вечарам таго дня штаб брыгады сумесна з камандаваннем палка распрацаваў план атакі на Новы Двор. Чапаеўцы

павінны былі наступаць на левым крыле палка і заняць паўднёвую частку Новага Двара, перарэзаць дарогу Новы Двор – Пружаны, каб не даць магчымасці адходу нямецкага гарнізона і не дапусціць прыхода іншых часцей на дапамогу. Партызаны заданне выканалі. Новы Двор быў вызвалены 15 ліпеня 1944 года.

Многія жыхары Новага Двара пайшлі на фронт. Аднасяльчане С.Пажарыцкі, Н.Сарай, І.Сушко, С.Патоцкі ўдзельнічалі ў штурме рэйхстага. На левай калоне вугальком, як успамінае Сцяпан Пажарыцкі, ён вывеў словы: “Мы з Новага Двара. Беларусы”.



У цэнтры вёскі, у скверы размяшчаецца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, дзе пахаваны 449 воінаў і 2 партызаны, якія загінулі пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 годзе на магіле ўстаноўлены помнік – скульптура воіна і партызанкі.

Пасля вызвалення края сяльчане прыступілі да аднаўлення разбурэнняў. Асабліва вялікі ўклад унеслі навадворцы ў нарыхтоўку і вываз драўніны для патрэб народнай гаспадаркі.

У 1949 г. група навадворцаў арганізавала першы калгас, назваўшы яго імем Дзяржынскага. Узначаліў калектыўную гаспадарку Якаў Матвеевіч Грушэўскі, член партыі з 1919 г. У калгас уступалі ўсё новыя і новыя сяльчане. Гаспадарка расла. 5 сакавіка 1959 г. на базе калгаса імя Дзяржынскага і іншых гаспадарак быў створаны саўгас.

У 1964 г. у выніку рэарганізацыі саўгаса “Поразаўскі” была сфармавана самастойная гаспадарка – саўгас “Новы Двор”. Як і ўсе сельгасарганізацыі, ён зведаў пераўтварэнні: племзавод, камунальная абласное сельскагаспадарчае унітарнае прадпрыемства, прыватнае прадпрыемства “Новы Двор-Агра” уваходзіць у склад ААТ “Гроднаазот”. У сакавіку 2012 года да гаспадаркі далучылі СВК “Корнадзь”.

Сёння Новы Двор – цэнтр сельсавета ў складзе ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства “Новы Двор-Агра”, якое неаднаразова станавілася пераможцам і прызёрам абласных і раённых спаборніцтваў па нарыхтоўцы кармоў і ўборцы ўраджаю. У 2009 г. Навадворскі сельскі Савет прызнаны лепшым у Гродзенскай вобласці па выніках Рэспубліканскага агляду-конкурсу.

З Новага Двара выйшла шмат вядомых людзей: Герой Сацыялістычнай працы, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1967-1971 гг.) Я.І.Рэкуць, двойчы ардэнаносец А.М.Раманоўскі (ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі), заслужаны ўрач Расіі М.У.Грыцкевіч, доктар медыцынскіх навук М.Ф.Філіповіч, доктар фізіка-матэматычных навук В.Г.Раманоўскі, а таксама кандыдат фізіка-матэматычных навук М.М.Грунтовіч, кандыдат эканамічных навук В.Д.Казлоўскі, кандыдат матэматычных навук В.І.Каскевіч, кандыдат тэхнічных навук В.М.Катаркевич, кандыдат фізічных навук Г.Дуброўская. У 2011-м годзе брыгадзір вытворчай брыгады ў жывёлагадоўлі А.С.Мацейка за высокія паказчыкі ў працы атрымала дзяржаўную ўзнагароду – медаль “За працоўныя заслугі”.



*Я.І.Рэкуць*



У 2007 г. Новы Двор атрымаў статус аграгарадка. Сацыяльная інфраструктура: ДУА “Навадворская сярэдняя школа Свіслацкага раёна”, ДУА “Навадворскі яслі-сад”, Дом культуры, бібліятэка, урачэбная амбулаторыя, музычная школа, пошта, аддзяленне “Беларусбанка”, комплексны прыёмны пункт, крамы, лазня.

Літаратура:


1. Курило, Я. От княжеской охотничьей резиденции до агрогородка: [к 600-летию упоминания д.Новый Двор] / Ядвига Курило // Свіслацкая газета. – 2009. – 24 сакавіка. – С.2
2. Полубинский, А. Из истории Нового Двора / А.Полубинский // Заветы Ильича. – 1984. – 18 августа. – С.4; 25 августа. – С.4; 1 сентября. – С.4
3. Раманаў, С. Новы Двор у XV – XX ст.: нарыс гісторыі мястэчка / Сяргей Раманаў // Ваўкавышчына. – 2011. – № 2. – С.7-14
4. Раманаў, С. Пад выявай збройнага арханёла: [з гісторыі Новага Двара] / Сяргей Раманаў // Свіслацкая газета. – 2009. – 19 верасня. – С.4
5. Раманчук, Г. Жыццё наша, шчасце і лёс: [з гісторыі в.Новы Двор. 1518-2003гг.] / Галіна Раманчук // Гродзенская праўда. – 2003. – 6 верасня. – С.4
6. Раманчук, Г. Новы Двор: і праз шэсць стагоддзяў новы: [да 600-годдзя вёскі Новы Двор] / Галіна Раманчук // Гродзенская праўда. – 2009. – 1кастрычніка. – С.4